*Не вучобай адзінай*

# Права на месца,

## ці Каго найперш чакаюць у інтэрнатах

**Пры згадванні БДУІР у многіх юнакоў і дзяўчат загараюцца вочы. І не дзіва, бо тут рыхтуюць IT-спецыялістаў — прадстаўнікоў прафесіі, запатрабаванай у сучасным свеце. Сёлета на першы курс дзённага аддзялення паступіла больш як 2 100 маладых людзей, 1292 з якіх — іншагароднія. Хто з іх мае шанц засяліцца ў інтэрнат? Як не страціць месца і прасунуцца па чарзе? Чым сустрэне новага жыхара агульны пакой?**



### Паступаць лепш з братам ці сястрой

У канцы лета на факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі праглядаюць заявы на жыллё. Пропуск у інтэрнат па-за чаргой атрымліваюць студэнты, пацярпелыя ад вынікаў чарнобыльскай аварыі; дзеці-сіроты; тыя, хто ўключаны ў спіс Банка даных адоранай моладзі; інваліды I і II груп. Потым ідзе першая чарга. Яе складаюць маладыя сем'і, замежныя студэнты, курсанты ваеннага факультэта, дзеці са шматдзетных сем'яў, выдатнікі, актывісты грамадскай, культурнай і спартыўнай работы, пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд. Цікава, што калі студэнтамі БДУІР становяцца адразу двое дзяцей з адной сям'і, яны таксама трапляюць у пакой інтэрната аднымі з першых. **Начальнік студгарадка БДУІР Анатоль ЛУЦКІ** тлумачыць:

— У нас «ільготнікі» і першая чарга засяляюцца поўнасцю. Астатнія селяцца ў незанятыя пакоі альбо чакаюць, калі з'явіцца вольнае месца. Мы прапануем жыллё студэнтам на ўвесь тэрмін вучобы, аднак кожны год узгадняем з жыллёва-бытавой камісіяй факультэтаў, ці трэба працягваць дагавор. Калі наш падапечны парушае парадак, мае спагнанне, якое вынесена загадам рэктара, яму адмаўляюць у пражыванні.

Сёлета ў інтэрнатах універсітэта вызвалілася толькі каля 500 месцаў. Гэта азначае, што частцы іншагародніх студэнтаў давядзецца шукаць кватэру ў горадзе.

— Намі сабрана спецыяльная база адрасоў, — расказвае **намеснік старшыні прафкама студэнтаў БДУІР Настасся ЛАТУШКІНА.** — Летась там знаходзіліся спасылкі прыблізна на 500 месцаў, дзе гаспадары былі гатовыя ўзяць да сябе кватаранта. Каля 700 студэнтаў скарысталіся гэтай паслугай. Некаторыя засталіся на знятых кватэрах і ў гэтым годзе, некаторыя вырашылі шукаць іншыя варыянты. Сёлета ў базе пакуль 345 адрасоў.

Для малазабяспечаных студэнтаў, якія здымаюць жыллё, існуе яшчэ дзяржаўная кампенсацыя памерам у тры базавыя велічыні, калі гаварыць пра Мінск. Аднак, каб ёй скарыстацца, трэба вучыцца на бюджэтным аддзяленні, мець дагавор арэнды памяшкання і даведку, што сярэднедушавы даход сям'і, у якой пражывае студэнт, не перавышае два бюджэты пражытковага мінімуму. У БДУІР летась кампенсацыю атрымлівалі толькі тры навучэнцы.

### «Кватэра» на пяць чалавек

Усяго ўніверсітэт мае чатыры інтэрнаты. Два з іх першай катэгорыі, так званыя «люксы». У адным блоку знаходзяцца два жылыя пакоі, кухня і санвузел з душавой. Па сутнасці, маленькая кватэра на пяць чалавек. Пражыванне ў такой раскошы каштуе 1,2 базавай велічыні — 25 рублёў 20 капеек. Інтэрнаты другой катэгорыі адрозніваюцца ад «люкса» толькі агульнай кухняй і абыдуцца жыхару ў 0,8 базавай велічыні. У будынках ёсць залы для самападрыхтоўкі, для спартыўных заняткаў, гурткі і клубы па інтарэсах.

**Цікава, што калі студэнтамі БДУІР становяцца адразу двое дзяцей з адной сям'і, яны таксама трапляюць у пакой інтэрната аднымі з першых.**

Самы стары інтэрнат №1 па вуліцы Якуба Коласа сёлета перажывае бягучы рамонт. Ужо заменены вокны, на кухнях адрамантаваны сталі, сцены, падлога, пакладзена пліткa, хутка з'явіцца новая мэбля. Рамонт працягнецца і пасля засялення.

— Перш чым яго распачаць, мы апыталі студэнтаў, — інфармуе **намеснік начальніка студгарадка БДУІР па інфармацыйнай і выхаваўчай рабоце Вольга РУТКОЎСКАЯ.** — Выселіць адразу 870 чалавек і хутка завяршыць работы ці аднаўляць будынак паступова. 90 працэнтаў апытаных пагадзіліся цярпець часовыя нязручнасці. Некаторыя студэнты нават прапаноўвалі праекты для пакояў. Частка з іх мы скарысталіся.

На другім паверсе шматпавярховіка, сапраўды, чуваць гул перфаратара — будаўнікі аббіваюць балконы. Аднак студэнтам грукат перашкаджаць не будзе, пасля засялення застануцца толькі аддзелачныя работы ў пакоях.

Другі інтэрнат знаходзіцца непадалёку, на вуліцы Леаніда Бяды. У 2014 годзе там скончылі капітальны рамонт. Кожнае лета адміністрацыя студгарадка адводзіць адзін інтэрнат для засялення ў летні перыяд удзельнікаў будатрадаў, замежных студэнтаў, моладзі, што займаецца навуковымі праектамі на кафедрах, студэнцкага актыву і інш. Сёлета такім агульным жытлом стала «двойка».

Што трэба рабіць, каб застацца ў інтэрнаце? Асноўныя правілы — падтрымліваць чысціню і не перашкаджаць іншым. Дзяжурыць па паверсе, калі давялося жыць у інтэрнаце другой катэгорыі. Абавязковай застаецца грамадска-карысная праца па добраўпарадкаванні інтэрната, як кажуць у студэнцкім асяродку, «адпрацоўкі». Усяго трэба адрабіць чатыры ўмоўныя гадзіны за месяц. Залічваецца не толькі праца па добраўпарадкаванні інтэрнатаў, але і творчая дзейнасць: дапамога падчас свят, выпуск насценгазеты, удзел у культурных і грамадскіх мерапрыемствах.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

**Даведка:**

**У 2015/2016 навучальным годзе паказчык забяспечанасці месцамі ў інтэрнатах навучэнцаў устаноў прафтэхадукацыі складаў 100 працэнтаў, сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 98 працэнтаў, а студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі — 81 працэнт (па Мінску — 77 працэнтаў). Мелі патрэбу ў засяленні ў інтэрнаты больш як 14 тысяч студэнтаў сталічных ВНУ. А ўсяго па краіне — 20,7 тысячы.**

**Самая напружаная сітуацыя складвалася ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, БДУІР, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце і некаторых іншых установах адукацыі. Таксама не ўсе студэнты задаволеныя ўшчыльненнем інтэрнатаў, на якое адміністрацыя вымушана ісці з дазволу санітарных службаў. Напрыклад, у БНТУ больш за 2,5 тысячы студэнтаў былі заселеныя звыш санітарных нормаў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# Як стаць сапраўдным студэнтам?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Старшакурснікі больш сур'ёзныя, а ў тых, хто яшчэ і працуе, проста на лбе напісана: «Гэта маё жыццё, якое я ўладкоўваю сам». Паліна — будучы менеджар-культуролаг. «Не ведаю, як іншым, але мне вучоба не здаецца нечым непад'ёмным, — дзеліцца студэнтка. — Калі ў школе за намі ўвесь час бегалі і прымушалі вучыцца, то цяпер уся адказнасць за ўласную адукацыю кладзецца на цябе. Я прывыкла вучыцца, працаваць над сабой і сваімі памылкамі. Яшчэ важна, каб выкладчык бачыў тваю працу на працягу семестра, тады здаць сесію лягчэй. Дзесьці можна нешта недавучыць па тэорыі, але паказаць свае веды на практыцы. Неад'емная частка студэнцтва — жыццё ў інтэрнаце. Там здарова, калі ты чалавек таварыскі і суседзі ў цябе добрыя. Мне вось пашанцавала і з групай, і з суседкамі: мы хутка пазнаёміліся, але пазнаваць адна адну працягваем да гэтага часу».

**«Важна, каб выкладчык бачыў тваю працу на працягу семестра, тады здаць сесію лягчэй. Дзесьці можна нешта недавучыць па тэорыі, але паказаць свае веды на практыцы».**

На маё пытанне, як змянілася яе жыццё за гэты год, Паліна адказала, што стала больш самастойнай, бо цяпер за яе ніхто не клапоціцца пра вячэру ці прыборку. Жыццё ўдалечыні ад бацькоў вучыць адказваць за свае дзеянні і не скідваць адказнасць на іншых. З пераездам зразумела, што любіць свой родны горад, хоча лепш яго пазнаць і ўнесці свой уклад у яго развіццё. Яшчэ аказалася, што яна не любіць гатаваць, але вадой сыты не будзеш, таму давялося вучыцца. «Самастойнае жыццё выдатна дапамагае зразумець, што ўсяму можна навучыцца, трэба толькі захацець», — кажа другакурсніца.

### ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

— Першая сесія прайшла як у тумане, — падзялілася сваімі ўспамінамі Дар'я Вараб'ёва, студэнтка факультэта англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. — Я нават апамятацца не паспела, як яна ўжо была здадзена. Усё было не так страшна, як мне расказвалі. Вучоба — толькі адзін са складнікаў студэнцтва. У нашым універсітэце вельмі шмат гурткоў, секцый, праводзіцца мноства розных мерапрыемстваў, пра якія нам расказалі на першым жа сходзе. Я прымаю ўдзел у дзейнасці валанцёрскага атрада «Мы — дзецям» і тэатра «Разам у казку». Акрамя гэтага, у вольны час гуляю па горадзе, чытаю, сустракаюся з сябрамі. Вядома, я сумую па доме. Жыць адной аказалася больш складана, чым я думала. Цяпер трэба самой вырашаць мноства бытавых пытанняў. Першы час у Мінску прыйшлося здымаць кватэру. Памятаю, як плакала, калі з'ехалі бацькі, і я засталася адна ў пустым пакоі. Потым прывыкла і асвоілася, да мяне часта прыходзілі сябры, так што самотна мне не было. Цяпер жыву ў інтэрнаце. Мне падабаецца, бо побач заўсёды ёсць нехта, хто можа дапамагчы, ёсць з кім пагаварыць і ўрэшце — у каго пазычыць соль ці падручнік.

### «НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА СЕСІІ»

Кожны год студэнтамі становяцца тысячы выпускнікоў школ. Першы год вучобы — важны этап у жыцці кожнага з нас. Усе па-свойму адаптуюцца да новай ролі: хтосьці лёгка і хутка, а некаму ў гэтым патрэбна падтрымка збоку. «Хто можа дапамагчы першакурснікам асвоіцца ў ВНУ?» — спытала я ў **педагога-псіхолага Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі Вольгі КАЗЛОВАЙ.**

— Іх заўсёды лёгка адрозніць ад астатніх студэнтаў, — гаворыць Вольга Рыгораўна. — Яны выглядаюць трохі збянтэжанымі, з асцярогай заходзяць у кабінет, але, з іншага боку, ім усё цікава. Яшчэ вельмі асаблівасць: прывыкшы за 11 гадоў да школьнай формы, яны яшчэ паўгода і тут прытрымліваюцца дзелавога стылю ў адзенні, а ўжо пасля першай сесіі пераходзяць на джынсы. Першы год вельмі паказальны, гэта своеасаблівая стартавая пляцоўка. Здольных студэнтаў відаць адразу. Таму трэба не саромецца праяўляць сябе і зарабляць аўтарытэт. Трэба ўліцца ў новы калектыў. Для гэтага неабходна ведаць сабе цану, але і не быць агрэсіўным. Часам здаецца, што на новым месцы ўсё будзе па-іншаму, але насамрэч, калі ў школе былі праблемы праз нізкую самаацэнку ці залішнюю ганарлівасць, то без працы над сабой сітуацыя можа паўтарыцца і ва ўніверсітэце. Бывае такое, што ўчарашнія школьнікі не могуць ужыцца з суседзямі па інтэрнаце або з аднагрупнікамі. Тут ужо прыходзяць на дапамогу старэйшыя таварышы: куратар, выхавальнікі, сацыяльныя педагогі. Разам яны шукаюць прычыну праблемы і імкнуцца яе вырашыць. Я ведаю выпадкі, калі з-за такіх непаразуменняў і недамовак студэнты проста забіралі дакументы з ВНУ.

Многія баяцца сесіі і адчуваюць напярэдадні яе велізарны стрэс. Тут важна не панікаваць, а дакладна паставіць перад сабой задачу і вызначыць шляхі яе рашэння. Кожны выпрацоўвае свой метад падрыхтоўкі: адны «зазубрываюць» тэорыю, іншыя больш увагі надаюць практыцы. Магу сказаць адно — калі рыхтавацца на працягу ўсяго семестра і праяўляць цікавасць да вучобы, то «валіць» вас на экзамене ніхто не стане.

...Я студэнтка. Напярэдзе ў мяне чатыры гады, каб пасталець, стаць спецыялісткай у выбранай сферы, той, кім хочуць бачыць мяне бацькі і кім я — сама сабе. А пакуль я ўсяго толькі студэнтка...

**Арына КАГАЛЁНАК,**
**студэнтка II курса Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.**